ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 140 (1107) | ЧАЦЬВЕР, 19-га чэрвеня 1930 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

XIII зьезд КП(б)Б

Заключнае слова тав. Васілевіча

па справаздачы ЦК КП(б)Б

Таварышы, абгаварэньне дакладу Цэнтральнага Камітэту партыі на раённых конфэрэнцыях, на ўсіх акруговых конфэрэнцыях і на XIII зьезьдзе КП(б)Б праходзіць пры вялізарнейшай актыўнасьці ўдзельнікаў, праходзіць пад агнём жорсткай бальшавіцкай самакрытыкі. Адначасова з абгаварэньнем працы Цэнтральнага Камітэту ўсюды, дзе ставіліся даклады ЦК, а таксама і тут на XIII зьезьдзе, значная ўвага звaрачаецца на лінію ЦК. Усюды (я ўпэўнены, што так будзе і на XIII зьезьдзе) лінія ЦК прызнаецца правільнай і работа здавальняючай.

Побач з гэтым пад жорсткі агонь бальшавіцкай самакрытыкі бяруцца паасобныя памылкі, зробленыя ЦК у справе колектывізацыі. Пад жорсткі агонь самакрытыкі бяруцца памылкі паасобных членаў Цэнтральнага Камітэту

Мне думаецца, правільна будзе адзначыць, што выступаўшымі прамоўцамі па дакладах т. Гея і маім, ня была зьвернута выстарчальная ўвага на рад пытаньняў пастаўленых у дакладах, хаця прамоўцаў выступала тут звыш 80.

Напрыклад, такое пытаньне, як пытаньне аб кадрах, аб кіраўніцтве комсамолам, работа сярод жанчын—гэтыя пытаньні, я-б не сказаў, каб былі абгавораны з выстарчальнай паўнатой.

Я думаю, што гэта трэба будзе паправіць у камісіях зьезду ў тым сэнсе каб у пастановах зьезду знайшлі свой адбітак усе недахопы, якія маюць месца ва ўсіх галінах нашага соцыялістычнага будаўніцтва і змаганьня і тыя задачы, якія ў гэтым напрамку стаяць

Паколькі супярэчнасьцяй супроць тых палажэньняў, якія я высунуў у справаздачы, з боку выступаўшых таварышоў ня было, мне амаль што няма на чым спыняцца ў сваім заключным слове, апрача раду пытаньняў, якія былі закрануты прамоўцамі і якія зьвязаны з паасобнымі памылкамі ў практычнай рабоце, што былі ў мяне.

Я, таварышы, разумею сваю задачу ў гэтай справе такім чынам, што пытаньне аб сваіх асобных памылках я пастаўлю рубам, пастаўлю выключна політычна і з гэтага пункту погляду буду іх разьбіраць.

Па-першае, адносна „недарэчнасьці" і адносна таго, што я быццам-бы ў сваім выступленьні на колегіі Наркомзему ў 1928 годзе рабіў установку на індывідуальныя гаспадаркі. У мяне напісана так: „Апрача ўсіх недарэчнасьцяй, зьвязаных з нашым апаратам мы будзем мець яшчэ адну недарэчнасьць, мы будзем мець у бліжэйшыя часы абвастрэньне клясавага змаганьня на вёсцы Мы будзем мець у сувязі з пашырэньнем соцыялістычнага будаўніцтва наступленьне кулацтва на колектывы, мы будзем мець націск на беднату з боку кулакоў, каб яна ня ішла ў колектывы. Мы будзем мець выступленьні супроць нашых мерапрыемстваў, якія вядуць да арганізаваньня, да колектывізацыі. У цэлым радзе выпадкаў кулацтва будзе зрываць нашы мерапрыемствы, будзе перешкаджаць нам працаваць, будзе ўклініўвацца ў нашу работу. Тут патрэбна правільная расстаноўка сіл ня толькі з боку якаснага, тэхнічнага, але і з боку клясавага, політычнага. Трэба ў рабоце дабіцца выразнай клясавай лініі і разам з актыўнай дапамогай батракоў, беднаты і серадьнякоў мы проблему ўраджайнасьці вырашым". Я думаю, што гутарка, якая тут ідзе, не дае падставы абвінавачваць мяне ў орыентоўцы на індывідуальную гаспадарку. Гэтай памылкі, якую прыпісвае мне т. Тамашэўскі, я не прызнаю.

У гэтым маім выступленьні правільна быў выпуклен момант аб тым, што бліжэйшы пэрыод часу будзе зьвязан з абвастрэньнем клясавага змаганьня на вёсцы. Аднак, гэты абзац заключае ў сябе адну зусім няправільную формулёўку, якая мае політычнае значэньне. У гэтым абзацы гаворыцца: „Апрача ўсіх недарэчнасьцяй, зьвязаных з нашым апаратам, мы будзем мець яшчэ адну недарэчнасьць, мы будзем мець у бліжэйшыя часы абвастрэньне клясавага змаганьня на вёсцы. Безумоўна, слова „недарэчасьць" у адносінах да клясавага змаганьня—няправільнае.

Справа ідзе не аб недарэчнасьці, а аб закономерным абвастрэньні клясавага змаганьня ў выніку росту соцыялістычнага будаўніцтва, у выніку ўзрастаючага кулацкага супраціўленьня нашаму соцыялістычнаму наступленьню Ня гледзячы на тое, што я гэту памылковую формулёўку даўно ўжо выправіў і ліст аб гэтым апублікаваў у друку, паколькі аб гэтай памылковай формулёўцы гаварылася на зьезьдзе, я перад зьездам гэту памылку яшчэ раз рашуча асуджаю без усякіх агаворак.

У выступленьні на пленуме ЦК ЛКСМБ у красавіку гэтага году, падкрэсьліваючы засьмечанасьць нашай вясковай організацыі, ня гледзячы на праведзеную чыстку я, пачаў гаварыць аб серадняку, даў нявыразную формулёўку, з якое выходзіла, што серадняк у партыі ня можа пьвёрда праводзіць лінію партыі сярод беднаты.

Гэты пункт маёй формулёўкі эустрэў на пленуме ЦК комсомолу крытычныя адносіны, і на другі дзень на тым-жа пленуме я выступіў і выправіў сваю нявыразную і політычна памылковую формулёўку. Ня гледзячы на тое, што я гэту няправільную формулёўку выправіў, мне трэба крытыкаваць таму, што я павінен быў больш сур'ёзна адносіцца да дачы формулёвак па важнейшым пытаньні.

Трэцяй і найбольш буйнай памылкай я лічу выступленьне на апошняй Фрунзэўскай раённай партыйнай конфэрэнцыі, дзе я гаварыў прыблізна так: „ЦК УсеКП(б), моцна і своечасова ўдарыўшы па перагібах, зманэўраваў, што калгасьнікі і бядняцка-серадняцкія масы былі своечасова організаваны і актывізаваны на сяўбу, таму мы ня маем зараз пагрозы недасеву". Слова „манэўр" я ўжыў няправільна таму, што гэта можа даць падставу тлумачыць удары па перагібах і скажэньнях лініі партыі ў колектывізацыі нейкім манэўрам ЦК. Гэта слова магло ўнесьці блытаніну ў той момант калі патрэбна была орыентаваць організацыю на барацьбу з перагібамі.

Тав. Шпэктараў падаў тут адну формулёўка, якая адносіцца да 1926 году, сказаўшы, што я гаварыў, што ў Беларусі няма кулакоў апрача дзьвёх акруг.

(Шпэктураў з месца: Я гэта выправіў у стэнограме.

У маёй стэнограме сказана „Але тых гаспадарак, якія, па вашай думцы, зьяўляюцца амаль кулацкімі гаспадаркамі, ці многа на Беларусі? Паводле маіх падлікаў такіх гаспадарак ня многа і яны будуць не ва ўсіх акругох, а толькі ў некаторых". Трэба, тав. Шпэктараў цытаваць тое, што напісана. На што выкідаць слова „амаль" і дабаўляць ад сябе „дзьве акругі". Мы ў той час у 1926 годзе ўвялі новы закон аб сельскагаспадарчым падатку, па гэтым новым законе частка серадняцкіх гаспадарак па адала ў вышэйшую групу і абкладалася падаткам большым, чым у мінулым годзе.

Гутарка ішла, такім чынам, не аб кулацкіх гаспадарках, а аб адпаведнай групе заможных серадняцкіх гаспадарак. Я гэту даведку падаў не для таго, каб бараніць цытаваную вышэй формулёку, бо лічу, што яна зьяўляецца блытанай формулёўкай. Калі рабіць з гэтай формулёўкі так вывад, што ў Беларусі кулакоў мала, што кулакі ёсьць не ва ўсіх акругах, то гэта формулёўка не адпавядае сапраўднасьці і зьяўляецца політычна шкоднай.

Зараз аб тав. Гершоне. Тав Штэйнман, выступаючы на зьезьдзе, гаварыў, што я на пленуме Менскага акругкому КП(б)Б няправільна выступаў і крытыкаваў установкі т. Гершона. Я ні ў якім выпадку не магу згэтым згадзіцца Т. Гершон на пленуме акругкому гаварыў наступнае: „Самае лепшае прапіса ь рэцэпт, што ў нас была недастаткова разгорнута самакрытыка і былі дапушчаны памылкі. Зразумела, і самакрытыка адыгрывае ролю, але ўсё зло ў тым, што быў даны тон, каб за два гады скончыць колектывізацыю. Гэты тон быў перанесен партарганізацыямі ў паасобныя ячэйкі, і Менская організацыя заключае соцспаборніцтва з Мазырскай акругай, сельская гаспадарка якое зяўляецца самай адсталай". Паводле гэтай установкі тав. Гершона выходзіць, што

адзінай прычынай усіх памылак, якія зроблены ў колектывізацыі ў нас, у БССР, зьяўляецца пастанова ЦК аб двухгадовым тэрміне колектывізацыі. Пастанова ЦК аб двухгадовым тэрміне колектывізацыі зьяўляецца памылковай, гэта прызнана Бюро ЦК, але ні ў якім разе ня можна ўзвальваць усе памылкі, зробленыя ў колектывізацыі, на гэту пастанову, гэтым самым выключаючы і на ЦК. Я даў рашучы адпор на Менскім акругкоме гэтай установцы т. Гершона і акругком са мною згадзіўся.

Наконт майго выступленьня на сьвяткаваньні пяцігадовага юбілею Белдзяржвыдавецтва. Я даю такую даведку. У рэзалюцыі Менскага акругкому і прэзыдыуму АКК, надрукаванай у нашых газэтах 6-га лютага 1930 году напісана наступнае. „Зьмест урачыстага пасяджэньня БДВ, за выключэньнем промоў прадстаўнікоў ЦК, ня быў падпарадкаван задачам барацьбы за клясавую вытрыманасьць выдаваемай Белдзяржвыдавецтвам прадукцыі, за выпраўленьне дапушчаных політычных памылак, рашучай барацьбы з нацыянал-дэмократызмам і выкананьне пролетарскай літаратурай задач, што ўскладаюцца на яе комуністычнай партыяй і рабочай клясай у пэрыод соцыялістычнай рэконструкцыі". Я маю права лічыць, што адным з гэтых прадстаўнікоў ЦК партыі быў я на ўрачыстым пасяджэньні БДВ і таму прыпісваць мне няправільнае выступленьне на юбілеі Белдзяржвыдавецтва няма ніякіх падстаў.

Вось адказ адносна тых паасобных памылак, якія тут былі адзначаны, якія мелі месца ў маёй практычнай рабоце. Я павінен сказаць, што ўся політычная вострасьць, якая навокол гэтых памылак была ў апошні час, яна па-мойму, карысна і для мяне асабіста, і для партыйнай організацыі, бо гэта ёсьць папярэджаньне таварышам, якія знаходзяцца на адпаведных вучастках кіраўніцтва і работы, больш сачыць за сабой, больш думаць аб тым, што гаворыш, што пішаш, ня кідацца фармулёўкамі.

Лічачы карыснай крытыку маіх паасобных памылак, якія мелі сапраўднае месца, я думаю будзе няправільным, калі даводзіць, што гэтыя паасобныя памылкі зьяўляюцца лініяй або тэндэнцыяй. Таксама няправільна рабіць параўнаньні гэтых паасобных памылак з лініяй правых, або з лініяй нацыянал-опортуністых Я думаю, што так ня варта ставіць пытаньня, бо гэта толькі заблытае справу, а трэба меўшы я месца паасобныя памылкі і таго, хто іх зрабіў, крытыкаваць політычна, крытыкаваць рашуча для таго, каб яны былі прызнаны, выпраўлены і для таго, каб у далейшым менш было памылак.

Наша організацыя пад выпрабаваным кіраўніцтвам Ленінскага ЦК УсеКП(б) падышла да свайго XIII зьезду і да XVI зьезду УсеКП(б), як ужо констатавалі раённыя і акруговыя партыйныя конфэрэнцыі і як гэта відаць на зьезьдзе, згуртаванай і бальшавіцка загартаванай організацыяй, загартаванай у змаганьні з трацкізмам, у змаганьні з правым і „левым" опортунізмам, у змаганьні з нацыянал-опортунізмам, з прымірэнцтвам да ўсякіх ухілаў ад ленінскай лініі, у змаганьні з нацыянал-дэмократызмам, з шовінізмам ўсіх колераў. Самае шырокае разгортваньне пролетарскай самакрытыкі дапаможа выканаць стаячыя перад намі задачы і дапаможа нам няўхільна праводзіць генэральную лінію комуністычнае партыі.

Фашысцкі тэрор і паліцэйскія дубінкі

ня спыняць пераможнага рэволюцыйнага руху

МАГУТНЫЯ ДЭМОНСТРАЦЫІ РАБОЧЫХ НЯМЕЧЧЫНЫ СУПРОЦЬ ЗЬНІЖЭНЬНЯ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ. 12 БАЎГАРСКІХ КОМСАМОЛЬЦАЎ ПРЫСУДЖАНЫ ДА 13 ГОД ТУРЭМНАГА ЗЬНЯВОЛЕНЬНЯ

ПАДРЫХТОЎКА ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР

СТОКГОЛЬМ. Шэраг прымет паказвае на ўзмоцненую падрыхтоўку вайны супроць СССР у басэйне Балтыцкага мора. Нядаўна ангельская эскадра наведала швэдзкі порт і прамысловы цэнтр Мальмэ, дзе кіруемая соцыял-фашыстымі паліцыя ўзброенай сілай перашкаджала братаньню ангельскіх маракоў з швэдзкімі рабочымі. У сучасны момант француская эскадра стаіць на стокгольмскім рэйдзе, а ў канцы ліпеня ангельская ваенная эскадрыльля ўтворыць вучэбны палёт у Швэцыю, Фінляндыю і Эстонію. Адначасова прыбалтыцкія краіны наводняюцца польскімі афіцэрамі. З другога боку, прадстаўнікі каманднага складу фінляндзкай, эстонскай і латвійскай армій наведваюць Швэцыю і Польшчу. Галоўнакамандуючы фінляндзкай арміі знаходзіцца ў гэты час у Стокгольме, а начальнік штабу робіць—„навучальнае падарожжа" ў Польшчу.

Дэманстрацыя рабочых Гамбургу

супроць зьніжэньня заработнай платы

БЭРЛІН. У Гамбурзе пад кіраўніцтвам рэволюцыйнай профопозыцыі адбылася ўнушальная дэмонстрацыя рабочых пад лёзунгам барацьбы супроць бясчыннага зьніжэньня заработнай платы, супроць прапанаванага соц. фашыстымі „міру ў прамысловасьці". Ля біржы працы паліцыя, узброеная гумавымі дубінкамі, напала на дэмонстрантаў і арыштавала аднаго рабочага. Дэмонстранты аказалі паліцэйскім рашучае супраціўленьне і вызвалілі арыштаванага. Тады паліцыя адкрыла агонь. Двое рабочых цяжка паранены.

Фашыстыя громяць левыя рабочыя організацыі

ГЕЛЬСІНГФОРС, 16 (Фінляндыя). Фашыстыя працягваюць выкраданьне левых політычных дзеячоў і пераходзяць да разгрому левых рабочых організацый. У Нівала фашыстыя разагналі рабочы сход, захапілі прыбыўшага для выступленьня на гэтым сходзе дзеяча рабочага руху Таннера і вывезьлі яго сілком у аўтамабілі ў другую мясцовасьць. Фашыстыя выкралі левага дэпутата сойму Тарунена, які накіроўваўся ў Кейтэле для выступленьня на рабочым сходзе.

„Няхай жыве комуністычная партыя і комсамол Баўгарыі!"

Гэтымі днямі ў Софіі (Баўгарыя) адбыўся суд над комсамольцамі Міло Стаяном, Блеевым, Грастовым, Ральчавым, Малевым, Сокалавым, Жодавым, Лютыбродскім, Еленай Хрыстовай. Іх абвінавачвалі ў прыналежнасьці да баўгарскага комсамолу. Акрамя таго, Лютыбордскаму было прад'яўлена абвінавачваньне ў тым, што ён разгарнуў чырвоны сьцяг у вёсцы Надзежда, а Елене Хрыстовай, што яна распаўсюджвала антымілітарысцкія лістоўкі сярод салдат у Софіі. Усе яны прыгавораны у агульнай складанасьці к 13 годам турэмнага зьняволеньня і к штрафу ў суме 570.000 лева (больш 9.000 рублёў). Лютыбродскі ў прыватнасьці прыгаворан к 12 з пал. гадам турмы. Падсудныя сустрэлі прыгавар суда выкрыкамі: „Няхай жыве комуністычная партыя і комсамол Баўгарыі".

Сьмяротнае пакараньне 3-х арабаў.

Абурэньні арабскіх організацый у зьвязку з прыгаворам

ЛЁНДАН, 15. З Ерузаліму паведамляюць, што ў сувязі з наступным пакараньнем трох арабаў, якія прыгавораны да кары сьмерцю за ўдзел ў жнівеньскіх паўстаньнях, сярод арабскага насельніцтва ў Палестыне пануе вялікае абурэньне. Арабскія організацыі зьвярнуліся да ангельскага вярхоўнага камісара ў Палестыне з просьбай зьмякчыць прыгавор. Падрыхтоўка да пакараньня суправаджаецца концэнтрацыяй войск, паліцыі, броньчастак і ваенных самалётаў.

Лятучкі сярод індыйскай паліцыі

ЛЁНДАН, 18. Па паведамленьню лёнданскіх газэт сярод індыйскай паліцыі распаўсюджваліся лятучкі, у якіх туземныя паліцэйскія заклікаюцца далучыцца да нацыянальнага руху і прыняць удзел у вызваленчай барацьбе.

Зьверскія ўчынкі над няграмі

НЬЮ-ЁРК. За апошнія пяць месяцаў у ПАЗШ утворана лінчаваньне сямі няграў.

Бастуючыя адабраюць лёзунгі компартыі

ПАРЫЖ, 16. Забастоўка на калійных рудніках Верхняга Рэйна ахапіла пагалоўна ўсе 10.000 занятых на капальнях горнякоў. На масавых сходах бастуючыя аднагалосна адабраюць лёзунгі компартыі, а таксама ўнітарных профсаюзаў, якія кіруюць забастоўкай.

ВЫСЫЛКА КОМУНІСТЫХ З ЭГІПТУ У СССР

ДАМАСК. Эгіпецкі ўрад пастанавіў сілком пасадзіць на савецкі параход цэлы шэраг арыштаваных комуністых для высылкі іх ў Савецкі Саюз.

У бюро ЦК ЛКСМБ

У сьвязку з ад'ездам на вучобу т. Джэлюка бюро ЦК ЛКСМБ пастанавіў аслабаніць т. Джэлюка ад абавязкаў сябра бюро ЦК, сябра рэдколегіі і рэдактара газэты „Чырвоная Зьмена". Па тэй-жа прычыне бюро ЦК аслабаніў ад абавязкаў бюро ЦК і старшыні ЦБ ДКА т. Буклей.

Пастановай бюро ЦК ЛКСМБ рэдактарам „Чырвонай Зьмены" зацьверджан тав. Самуцін В. Ам. (да гэтага часу працаваў намесьнікам рэдактара) т. Самуцін кааптіраваны ў члены пленуму і бюро ЦК ЛКСМБ.

Старшынёю ЦБ ДКА бюро зацьверджан т. Карнееў М. (т. Карнеяў да гэтага часу працаваў сэкратаром Бабруйскага АК ЛКСМБ).

„Дні пяцігодкі
На поўным хаду,
Песьня,
хутчэй
зьвіні!
Новых заводаў
Гудкі
Гудуць,
Пераганяем
дні“

ДЗЕЦІШЧА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ІНДУСТРЫІ— СТАЛІНГРАДЗКІ ТРАКТАРБУД
УВАШОЎ У СТРОЙ

„Хутка памкнецца
у зелень нівы
пад
прыгожасьцю усходу—
Кожныя шэсьць
славутых
хвілін
Трактар
палям
ад заводу!“

Сталінградзкі трактарны завод, пабудаваны дзякуючы вялікаму ўздыму працоўных мас, шырока разгорнутага социялістычнага спаборніцтва,—раней тэрміну распачаў сваю працу

Адчыненьне Трактарабуду—буйная перамога пяцігодкі

У галодным 1919 годзе, на VIII зьезьдзе партыі, гаворыць Ленін:

— Калі-б мы маглі даць заўтра 100 тысяч першакласных трактароў, забясьпечыць іх бэнзінай, забясьпечыць іх машыністымі (вы дасканала ведаеце, што пакуль гэта—фантазія), дык сярэдні селянін сказаў-бы: «Я—за комуну».

— У 1925 годзе Дзяржынскі падымае пытаньне аб пабудове ў СССР трактарнага заводу. Але краіна яшчэ не аправілася, краіна яшчэ не настолькі багата, каб даць будаўніцтву мільёны рублёў.

— У 1926 годзе Галоўметаль атрымлівае прадпісаньне пачаць падрыхтоўчыя работы да пабудовы трактарнага заводу. На той-жа Галоўметаль ускладзена задача выбраць тып трактара, які павінен будзе вырабляцца на першым савецкім заводзе.

— 1927 год. Агромністая пустэча пад Сталінградам, якая мяжуецца з астраханскімі стэпамі, абрана для пабудовы тут трактарнага заводу. Сталінград багаты добрымі воднымі і чыгуначнымі шляхамі зносін. Трактары з заводу пойдуць галоўным чынам на паволскія палі і палі Паўночнага Каўказу. Таму пустэча найбольш выгодна для пабудовы.

— У тым-жа годзе асобая ўрадавая камісія рашыла, што завод будзе выпускаць трактары сыстэмы „Інтэрнацыянал“. Гэты трактар эканомна выдаткевае гаручае. Магутнасьць яго дастатковая, каб задаволіць патрабаваньням паўночна-каўкаскіх і паволскіх палёў.

— Двесяць тысяч трактараў у год, магутнасьцю ў 10-20 конскіх сіл кожны—вось заданьне СПА. Заданьне дадзена ў чэрвені 1927 году, але ўжо ў красавіку 1928 году СПА прымушан зьмяніць сваю першапачатковую намётку і павялічыць задавы выпуск заводу да 20000 трактароў. У сьнежні 1928 году згодна трэцяга варыянту завод атрымоўвае заданьне на 50000 трактароў, магутнасьцю ў 15-30 конскіх сіл.

— На вялізарнай плошчы ў 540 гэктараў пачынаюцца вышукальныя работы, пачынаецца пабудова жыльлёвых памяшканьняў для сэзоньнікаў. У ліпені 1929 году скончаны чарцяжы на будынак асноўных цэхаў. Падыходзіць пакрысе да вялікай пусткі будаўнічы матар'ял. Восень. І вось пачынаецца ўдарная работа па пабудове цэхаў.

— Ужо вядомы абрысы будучага волата. Вытворчасьць трактароў будзе сконцэнтравана ў трох вялікіх цэхах—кавальным, ліцейным і мэханічна-зборачным. Гэтыя тры цэхі былі пабудаваны такімі тэмпамі, што нават галава амэрыканскай будаўнічай фірмы—Альбэрт Кан—павінен быў заявіць:

— Рабочыя і інжынэры Сталінграду паказваюць такія дасягненьні, якія ні ў якім разе ня змогуць быць дасягнуты ў нашай карїне.

Аб вялізарнасьці заводзкіх цэхаў можна меркаваць па такіх лічбах.

Мэханічна-зборачны цэх разьмешчаны на 5-ці гэктарах зямлі. Ён будзе вырабляць 1900 дэталяй для трактараў. Тут будуць працаваць каля 900 варштатаў і звыш 8000 рабочых, кавальны і ліцейны цэхі будуць даваць 700 трактарных дэталяй.

Ва ўсіх гэтых цэхах работа будзе адбывацца адзіным патокам. Кожны варштат будзе выраблядь раз на заўсёды зада ыя яму дэталі. Затым усе яны пойдуць для зборкі на агульны конвэйер.

Акрамя гэтых трох гігантаўцэхаў, завод распадаецца на некалькі буйных дапаможных:

інструмэнтальны, рамонтна-мэханічны; тэрмічныя майстэрні; сілавая станцыя.

Усяго на заводзе будзе працаваць 10.000 рабочых, інжынэраў, тэхнікаў і служачых. З іх—300 амэрыканцаў.

Амэрыканскія фірмы для зборкі, клёпкі і ўстаноўкі конструкцый мэханічна-зборачнага цэху назначылу 163 дні. Усе гэтыя работы, на зьдзіўленьне амэрыканцам, удалося выканаць у 28 дзён.

Кавальны цэх быў пабудаваны ня ў 170 дзён, а ў 45 дзён.

Ударнаму будаўніцтву ішлі на дапамогу колгасьнікі, рабочыя Сталінграду і іншых прамысловых цэнтраў.

Калі паўночна-каўкаскія станічнікі даведаліся, што заводу не хапае жвіру, яны наладзілі нядзельнік. У выніку некалькі цягнікоў са жвірам прышлі на будаўніцтва бясплатна. Комсамольцы, хатнія гаспадыні, рабочыя калёнамі прыходзілі на пабудову і суботнікамі дапамагалі ўздымаць трактарны волат пяцігодкі.

Людзі працавалі ня лічачыся з часам і надвор'ем. У пургу, у дождж, у сьнежныя мяцельныя дні. Шырока было разьвіта соцыялістычнае спаборніцтва і рух ударных брыгад. І да сьнежня асноўныя цэхі былі падведзены пад дах.

Амэрыканскія фірмы не пасьпявалі за такімі тэмпамі. Абсталяваньне з Амэрыкі спазьнілася на некалькі месяцаў. Мантажнікі не замяшаліся. Да грузчыкаў Новарасійску яны паслалі свае брыгады. Аб'яднаныя брыгады грузчыкаў і трактарабудаўнікоў разгружалі амэрыканскія параходы і пасылалі машыны спэцыяльнымі маршрутамі на трактарную. 24 мая пачалі прыходзіць параходы з абсталяваньнем у Новарасійск. І ўжо к 3 чэрвеня сотні варштатаў стаялі на сваіх мясцох у цэху.

Ударная работа дазволіла ісьці побач з надзвычайнымі тэмпамі. Завод быў пушчан раней тэрміну.

Быў такі час, калі завод думалі пусьціць толькі к кастрычніку 31 году, з тым, каб ён даў у гэтым годзе 75 трактароў, у наступным — 1100 трактароў і толькі к канцу 1934 году меркавалася давесьці выпуск да 40 тысяч трактароў у год.

Пляны перакрэсьлены крыж-на крыж. Завод пушчан 17-га чэрвеня 1930 году—на год раней тэрміну. У гэтым-жа—1930 годзе—ён дасьць краіне 25.000 трактароў, а з будучага году бязупынна будуць выходзіць з варот заводу 50.000 трактароў у год. Што для гэтага патрэбна? Для гэтага патрэбна, каб праз кожныя 5 з паловай хвілін выходзіў з конвэйера гатовы, сабраны жывы трактар.

* Сталінградзкаму трактарнаму заводу патрэбны ня толькі чыгун, жалеза, сталь і машыны,—яму патрэбны людзі. У лістападзе мінулага году ЦК комсамолу правёў мобілізацыю некалькіх тысяч комсамольцаў на трактарны гігант. Зараз гэтыя комсамольцы ўжо стаяць ля варштатаў. Першыя трактары будуць зроблены іх рукамі.

* Сталінградзкі трактарны завод—толькі першанец савецкага сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва. У хуткім часе будзе пушчаны ў ход трактарны завод з такой-жа вытворчасьцю—Харкаўскі. Ужо гатоў і пачаў працаваць вялізарны трактарны цэх на Пуцілаўскім заводзе. І, нарэшце, закладзен завод у Чалябінску, які будзе выпускаць 50.000 гусенічных трактароў, магутнасьцю ў 50 конскіх сіл кожны.

„Хто чуе наш голас?“

ЮНКОР БУДАЎНІК ПЫТАЕ:

Ці пападае ў цэль юнкораўская заметка? Ці ня б'ем мы ўхаластую? Чаму не сваечасова рэагуюць на юнкораўскія заметкі? Дзе выхад?

Організуйце масавыя чыткі і абгаварэньні ліста!

Ліст у рэдакцыю

ПАВАЖАНАЯ „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“!

Прашу не адмовіць зьмясьціць на сваіх старонках наступнае: Пасьля доўгай, праўда, з перабоямі, юнкораўскай працы я прымушан быў зрабіць некаторыя вывікі.

Неабходная, карысная праца

Калі я пачаў пісаць у газэту, я быў вельмі ўпэўнены, што я раблю надзвычайна неабходную і карысную рэч. Я ставіў сваёй мэтай выкрываньне ўсіх недахопаў і скажэньняў, якія я бачыў з тым, каб праз газэту маглі вучыцца ўсе як трэба і ня трэба працаваць. Я сам з захапленьнем пісаў і сам сачыў за тымі матар'яламі, якія павінны выкрыць недахопы і паслужыць штурхачом для выпраўленьня гэтых вывішчаў.

Пасьля зьмяшчэньня цэлага шэрагу артыкулаў перад мною паўстала пытаньне: ці дасягае юнкораўская заметка сваёй мэты. Ці ня б'ем мы ўхаластую. Хто чуе наш голас.—І на ўсе гэтыя пытаньні я сабе адказу ніяк не знайшоў.

Я памятую, калі ў газэце была зьмешчана мая заметка „Добры таварыш зрабіўся чынушай“, у якой я паказаў аб працы прадстаўніка моладзі ў ЦП саюзу будаўнікоў. Ніякага адказу ня было. Праўда, праз некаторы час гэты таварыш быў аслабанён, бо яго накіравалі на іншую больш адказную працу. Зараз працуе другі, але ніякага зруху няма, усё ідзе па старому. Сыстэма засталася неперабудаванай

... але ніякіх зьмен ня было

Нядаўна, я гутарыў з адным з сваіх таварышоў. У гутарцы ён мне расказаў аб дрэннай працы профшколы, у якой ён працуе. Я пытаюся:

— Чаму-б табе не напісаць аб гэтым у газэту? Ён адказвае, што некалькі разоў пісаў, друкавалі, але ніякіх зьмен ня было. Вельмі часта людзі, пра якіх пішаш, застаюцца на сваіх мясцох і ніякіх вынікаў ніхто ня робіць. Пасьля гэтага яны часта сьмяюцца з юнкораў гіранічна зьдзекваюцца.

Я памятаю, што прайшло ўжо шмат часу, як быў зьменчан ліст тав. **Міхася Іткіна «Самакрытыка па Нова-Беліцкі»**, у якім пісалася, што юнкораў, якія выкрываюць бесгаспадарнасьць выключаць з комсамолу і г. д... І нягледзячы на доўгі час і на абураючыя факты адказу і расьследваньня мабыць ня было, бо ў газэце я яшчэ ня бачыў. Ня лепшы лёс сустрэў артыкул тав. Л. Глезера „Да адказнасьці заціскачоў самакрытыкі“, у якім пісалася аб юнкоры Міхасе і цкаваньні, якое ўчыняюць над ім на заводзе.

Можна прывесьці яшчэ цэлы шэраг матар'ялаў, якія сьведчаць, што зьмешчаная заметка ў большасьці ў цэль не пападае, што выстрал атрымоўвецца халастым.

Хто чуе наш голас?

Гэтым лістом я зварочваюся да рэдакцыі і ўсіх юнкораў, чытачоў. Наш друк выклікан партыяй выконваць вялікую адказную справу. Ці магчыма ў далейшым такія адносіны да зьмешчаных матар'ялаў? Ці чытае пракуратура і адпаведныя органы „Чырвоную Зьмену“, і рэагуюць на зьмешчаныя матар'ялы? Па-мойму, не!

Я прашу асьвятліць гэтае пытаньне ў газэце з тым, каб сумеснымі сіламі былі знойдзены шляхі для барацьбы за меткасьць зьмешчаных матар'ялаў, за чуласьць да юнкораўскага пяра.

Спадзяюся, што ліст будзе надрукаваны, і я атрымаю адказ ад рэдакцыі юнкораў, чытачоў і адпаведных органаў на хвалюючыя мяне і шмат каго пытаньні.

З комсамольскім прывітаньнем
Юнкор Будаўнік.

Ад рэдакцыі:

Рэдакцыя лічыць, што ўзьнімае пытаньне юнкорам **Будаўніком** аб дзейнасьці юнкораўскіх заметак мае надзвычайна важнае значэньне. Аднак, рэдакцыя ўгледжвае ў гэтым лісьце шэраг няправільных высноў і сьцьвярджэньняў, таму мы ставім гэты ліст на абгаварэньне ўсіх юнкораў і чытачоў. Чакаем водгукаў.

Эстафэта да XVI зьезду УсеКП(б)

УДАРНА РЫХТАВАЦЬ РАПАРТЫ

Яшчэ да гэтага часу па ўсёй Беларусі не разгарнулася падрыхтоўка да здачы рапартоў эстафэце.

Ня гледзячы на тое, што «Чырвоная Зьмена» неаднакроць пісала аб тым, што эстафэце павінны быць уручаны рапарты ўсёй Беларусі, комсамольскія організацыі гэтым пытаньнем не займаюцца і адзелываюцца маўчаньнем.

Мы яшчэ раз паўтараем: ВУСНАМІ ЭСТАФЭТЫ ПАВІННА РАПАРТАВАЦЬ УСЯ БЕЛАРУСЬ. Кожная фабрыка, кожны колгас і савгас павінны расказаць аб сваіх дасягненьнях. Мы пытаем комсамольскія фізкультурныя організацыі: Што вы зрабілі для таго, каб забясьпечыць усебеларускі рапарт зьезду? Як мобілізавана грамадзкасьць на гэту вялікую справу.

Памятайце! Засталося 9 дзён—навярстайце згубленае!

Хроніка эстафэты

Аўто-мото-вэлё эстафэта з рапартам аб працоўных дасягненьнях да XVI партыйнага зьезду павінна даць старт 28 чэрвеня, а 12 гадзіне дню.

З Менску эстафэту павязуць вэлёсыпэдысты-ударнікі наступных заводаў: „Энэргія“, „Комунар“, „Бальшавік“, „Эльвод“, „Дрэвaапрацоўвачнік“, „Акцябр“ і чыгунка. Акрамя гэтага паедзе адна лёгкавая машына і мотацыклет.

Сёньня гэтыя заводы пачынаюць распрацоўку рапартоў.

Зацьвярджэньне рапартоў і выбар ударнікаў для дастаўкі эстафэты будуць праведзены на рабочых мітынгах да 22 чэрвеня.

Гомель прыме эстафэту Адэсы і дасьць старт 28 чэрвеня ў 20 гадзін 30 хвілін.

Гомельская каманда правядзе эстафэту праз Холачы, Матневічы, Доўск, Прапойск, Чэрыкаў, Крычаў і здасьць яе ў Рослаўлі.

Дзейна рыхтуецца да здачы рапарту друкарня „Палесдрук“ перавыканаўшая промфінплян.

Прадпрыемствы, савгасы і калгасы Случчыны XVI-му зьезду ЎсеКП(б)

Прадпрыемствы і колгасы Случчыны шырока разгарнулі соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

Рабочыя і служачыя млыну і пільні „Ўсход“ у гонар зьезду перавыкаваўшы плян за першае паўгодзьдзе на 75 проц. абвясьцілі сябе ўдарнымі і абавязаліся весьці рашучую барацьбу за павышэньне вытворчасьці, за палепшаньне якасьці продукцыі і за паніжэньне сабекошту.

Рабочыя жывёлабойні і кішачнага заводу па прыкладу рабочых млыну і пільні „Ўсход“ таксама абвясьцілі сябе ўдарнымі і абавязваюцца перад XVI зьездам партыі яшчэ больш выконваць поўнасьцю і ў тэрмін працу. Не адстаюць і колгасы.

Комсамольцы колгасу „КІМ“ пасьпяхова скончыўшы сяўбу з значным перавыкананьнем разгарнулі працу па будаўніцтву і падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі.

Створаны брыгады. Наладжваецца культурна-масавая праца колгасаў, распрацоўваюцца тэзісы т. Якаўлева.

Колгас узяў на сябе абавязак разгарнуць працу сярод батрацтва, беднаты і серадняцтва, уцягнуць лепшую моладзь у шэрагі ЛКСМБ.

Вядзецца падрыхтоўчая праца да ўборачнай кампаніі па колгасу „Чырвоны Працаўнік“. Колгасьнікі абвясьцілі сябе на час будаўніцтва, уборачнай кампаніі і асеньняга севу—ударнымі.

Уся праца праводзіцца пад кіраўніцтвам партыйна-комсамольскіх ячэек.

Так рабочыя і колгасьнікі Случчыны рапартуюць партыйнаму зьезду.

М. Ш.

Літаратурная старонка



(Канец. Пачатак гл. ў „Ч. З.“ № 95)

Значыць, вы хочаце, каб я вам расказаў.. Што-ж раскажу!

Верачка глядзела на яго, як раней ледзь-ледзь насьмешліва, паўпрыплюснутымі вачыма,—гэта выклікала ў ім раптоўнае раздражненьне, нават некаторую няясную злобу. Жаданьне расказаць ёй эпізод узмацнілася. Захацелася памучыць яе апісаньнем крываых ран, нанесеных той клясе, да якое яна прыналежала, захацелася зачапіць за жывое, зрабіць ёй балюча, а насьмешлівыя вочы насыціць журбою.

— Свайго бацькі я ня ведаў! Ён загінуў на царскай катарзе... да майго нараджэньня... Ён быў просты шавец—просты шавец!—злосна і хмурачыся паўтарыў Пятроў, нібы хлестануў пугаю па аголеных плечыках.

— Пасьля таго, як бацьку забралі, матка паступіла на работу да саматужніка... Мне давялося з самага раньняга дзяцінства зазнаць пакуты... Успамінаю свае дзіцячыя гады без таго захапленьня, з якім успамінаюць сваё дзяцінства дзеці буржуазіі. Наадварот,—здрыгаюся ад жаху, што я не адзіны, якому давялося ўсё гэта спрабаваць...

Навошта я ім усё гэта расказваю?... Гэта іх зусім ня цікавіць... трэ' было пачаць з другога канца, —прабегла думка. Не, няхай ведаюць, як пакутвалі і галадалі дзеці пролетараў, калі яны, весёлыя і сытыя, ладзілі гулянкі ў сваіх асабняках...—Неўзаметкі для самога Пятрова Верачка і Аркадзь Паўлавіч у яго думках пачалі фігураваць у ролі прадстаўнікоў цэлае варожае клясы. Ня ім двум кідаў ён праўду аб сабе, а ўсёй клясе, да якое яны належалі, з-за гэтага упарта і падрабязна расказваў.

— Калі падрос:—заняўся гандляваць газэтамі... потым стаў дапамагаць дворнікам прыбіраў сьмярдзючае сьмецьце з панскіх двароў... У шаснаццатым годзе—пятнаццацігадовым хлапчуком паступіў на завод... цягаў цяжкія ваганэткі...

Аркадзь Паўлавіч, заняты сваімі думкамі, слаба прыслухоўваўся да таго, што расказваў Пятроў. Але тварык Верачкі выцягнуўся. Яна слухала з дзіўным хваляваньнем. Пятроў тлумачыў па-свойму гэтае хваляваньне і з запалам працягваў апавяданьне.

Ён расказаў аб сьлязінцы на кончыку носа старэнькай маццеры, аб пацалунку сухіх, зморшчаных губ, аб даручэньні камандзіра атраду, аб пагоні за ім двух юнкероў і аб бахнуўшым у пустаце Арбату стрэле.

Аркадзь Паўлавіч напоўляжаў у крэсьле і ўважліва сачыў за стужкай дыму свае́й цыгары. Маленькае воблачка дзівосна распласталася і клубілася пад абажурам, як хмарка ў мініатуры, якая закрывае дыск месяца.

... Юнкеры асталіся далёка ззаду... Я кінуўся ў глыб двара... Убачыўшы кучу рызьзя... сунуўся туды... У самой сьценкі знайшоў паглыбленьне.. парашыў залезьці і схавацца... Толькі зарыўся, як падбеглі юнкеры.

—Ну, бальшавік,—выходзь!—сьмяецца сіплы голас. Ляжу. Маўчу. У руцэ сьціскаю бульдог... Прыслухоўваюся... варочаюць... б'юць прыкладамі па скрынях... і лаюцца намацеры...

— Куды-ж ён згінуў?!—пытаецца сіплы голас. Радуюся... думаю—пойдуць.

Раптам з боку чуецца бразгатлівы старэчы голас.

— Ён тут!.. Вось тут схаваўся! —Юнкеры зноў шукаюць... Сярдзіта варочаюць штыхамі... перакатваюць бочкі.., раскідваюць скрыні... Вось дабраліся блізка. Зьбіраюся выскачыць з свайго прытулку... Усёроўна, думаю,—прападу. Але ўскрыкваю ад моцнага болю... Гэта яны штыхом праткнулі мне руку...

— Га! Вось,—папаўся!—радасна крычыць малады юнкер і робіць рух вінтоўкай, як-быццам рыбу выуджвае. Другой юнкер са шрамам на скроні і адвіслай губою глядзіць на мяне расчаравана.

— Ну і рыбу-ж мы паймалі!

Каля юнкера са шрамам стаіць сівы, агідны стары ў белых пальчатках і капялюшы... Ён глядзіць на мяне і радасна пацірае рукі... Сьмяецца бразгатлівым сьмешкам. Малады юнкер раптоўна моцным ударам прыклада валіць мяне з ног.. Разьдзявайся!—крычыць... Я пакорліва разьдзяюся. З левай пракалатай рукі сачыцца кроў... але я не адчуваў болю... Блізкая, немінучая сьмерць адчувалася усім целам як цёмны і страшны вір, куды мне прыдзецца зваліцца.

Ужо даўно ня бачыў Пятроў ні пакою, ні Верачкі, ні Аркадзь Паўлавіча. Ён бачыў сябе ізноў, як некалі,—на Арбаце і па-новаму перажываў зьдзекі юнкероў, агіднага пана.

Аднекуль зьявілася на сцэну залатавалосая дзяўчынка і франтаваты хлопец з рабым тварам.

— Татачка! — спыталася дзяўчынка,—што гэта будуць рабіць?

— Нічога, мая дачушка, нічога... хе-хе-хе-хе! .—адказаў бразгатлівы голас—бальшавіка, бачыш, хочуць растраляць ..

Я пагладзеў... Полымя жоўтае і зялёныя кругі засьцілі твары. Засталіся ва ўспамінах залатыя валасы дзяўчынкі і рабы твар франта..

— Вось як,—пачуў я голас франта,—і бальшавікі, відаць, ходзяць у панчохах!.. А залатаны-ж яны як!—працяжна закончыў ён.

Юнкер са шрамам набіў ружжо..,

— „Да сьценкі“!—коратка скамандаваў ён.

— Татачка, яго зараз растраляюць! дзяўчынка заскакала ад радасьці.—Ах, як цікава, як весела!.. Я буду бачыць усё!

Франт усё-ж такі захваляваўся і закурыў папяроску... Я стаў каля сьценкі; юнкеры навялі вінтоўкі... Раптам закрычаў стары:

— Панове! панове! Прашу вас,—адну хвілінку!... Ён падышоў да юнкероў блізка і, весела паціраючы рукі, нешта сказаў ім.

— Чаго там. можна і тут!—крыкнуў рабы хлопец

— Не, не,—прашу вас, панове!

Мяне павялі на вуліцу.. Агідны стары бег за намі і радасна задыхаўся...

— Вось тут можна, каля слупа, —крыкнуў ён.

Але крык яго замер...

Аглушаючы стрэл грукнуў з завулку... Юнкер са шрамам і адвіслай губою мякка шмякнуўся аб брук... Старыкашка, сьмешна раскарэчыўшы ногі, ляцеў у падскочку да сябе на двор... Другі юнкер застаўся стаяць з паднятымі рукамі...

З завулку вышаў невялікі атрад чырвонагвардзейцаў... Камандзір атраду,—знаёмы токар з нашага заводу (ён потым загінуў на польскім фронце)—пазнаў мяне... Я расказаў яму ўсё... Памятаю: голас мой дрыжаў... Злоба токара...захлынула мяне і сьціскала горла.

— Так, так!—прабурчэў Вавілаў скрозь моцна сьціснутыя зубы.—Вось, сволачы!.. Вось сволачы! Ён падышоў да юнкера і прашаптаў яму ў твар:—Агідная сволач!

Юнкер нізка апусьціў галаву заплюшчыў вочы... Вавілаў стрэлам з маўзэры раздрабіў яму чэрап... Мне зрабілі перавязку... Вавілаў зьняў з забітага юнкера шынель і даў мне надзець.

Яна мела пах яшчэ цёплага чалавечага цела.

Агіднага старога мы адшукалі пад сталом у раскошным асабняку. Сілком выцягнулі на двор... За намі бегла золатавалосая дзяўчынка... Яна хапала за фалды і цалавала боты...

— Татачку, татачку не забівайце!—крычала яна...

Хлапца мы не знашлі... Ён кудысьці зьбег...

Старога ставілі да сьцяны, але ён не хацеў стаяць і сьмешна падаў на зямлю... Губы былі у шэрай пене, як у ашалелай жывёліны, а знутры, з горла, даносілася ідыёцкае мычаньне: ы-у-у-у... ы-у-у...

А з заду раздаваўся аглушальны візг дзяўчынкі...

* * *

...Здаецца Пятрову, што ён чуе гэты візг, што рыданьні—тут. вось, побач з ім.

Яшчэ ўецца дымок цыгары навакол электрычнага месца. На стале стаіць недапітая бутэлька шампанскага... Але дзіўна!—Хто-ж гэта ўсё яшчэ рыдае тут побач? Чаму згорбіўся і закрыў твар рукамі Аркадзь Паўлавіч? Чаму так дзіўна і гістэрычна ўздрыгваюць плечыкі Верачкі, а залацістыя валасы так неахайна ўскалмачаны. Адкуль зьявіўся тут на сьцяне портрэт агіднага пана? Здорава тады вымазалі крывёю сівую бараду!

Так вось яно што!!!

Пятрову адразу стала ўсё ясна.

Стала ясна, чаму яму паказаўся твар Аркадзь Паўлавіча такім знаёмым пры спатканьні у канторы, чаму транспортэр Штоца аказаўся недапасаваным у рабоце з дызэлямі Вігэра.

— Плечыкі Верачкі, як і раней, гістэрычна ўздрыгваюць, а з пад стала даносіцца візг золатавалосай дзяўчынкі.

Аркадзь Паўлавіч сядзіць сгорбіўшыся, закрыўшы твар рукамі. згаслая цыгара тырчыць забытая і непатрэбная паміж пальцамі, а на стале стаіць недапітая бутэлька шампанскага.

Пятроў устаў, правёў рукою на ўсклапцелых валасах. Спакойна нацягнуў паліто, зашпіліў на ўсе гузікі і вышаў, нічога не сказаўшы. На вуліцы ня стаў шукаць звозчыка, а накіраваўся пехатой дамоў.

— Дык вось яна, — Аннібалава прысяга ворага.. Транспортэр Штоца недапасаваны... Вораг выпаўняў сваю прысягу!

Пятроў ішоў па бязьлюднай вуліцы і як дзіцёнак, ціханька шаптаў прысягу вернасьці сваёй клясе. Ад гэтага дня ён на ўсё жыцьцё захавае непрымірую нянавісьць да ворагаў сваёй клясы...

Так прысягаў у старажытныя часы Аннібал свайму бацьку—палкаводцу Гамількару „у бажніцы перад ахвярнікам, што будзе весьці непрымірую барацьбу на ўсё жыцьцё з рымлянамі-ворагамі роднага Карфагену.

Тодар Алесін

ГАРАДОК

(Вынятак з паэмы)

„Зараз на Камароўцы ствараецца асяродак навукова-дасьледчай працы Савецкай Беларусі“

„ЗЬВЯЗДА“.

Дзе век
Крывавай пагулянкай
Кіпеў заглохнуты куток,
Дзе век
Былі разбоі з п'янкай—
Паўстаў навукі гарадок.
Агні Кастрычнікавай буры
Кры ом праменьнямі ў залатых
Радзімі
Выстаўку культуры
Сярод лясоў,
Балот пустых.
І больш
Абшараў аксаміту,
Дывян
Зьдзічэлае травы,
Кустоў пахілае ракіты
Не аплачуць журавы.
Куды ім лезьці
З нудным крыкам?!
Няхай сьпяваюць угары,
А тут бяз іх—
Маторным крыкам
Прастор заглушаць трактары.

* * *

Руплівым раньнем
Цемру ночы
Прагнала дзесь
За небасхіл..
Дзесяткі
мускулаў рабочых
кладуць
кладуць
Цэмэнты ўсьцін
Машыны,
Крышачы каменьні,
Разжаваць думку.
Каб сказаць:
ўзрастаюць
гэтыя в шыні
Краіне сьцежкі паказаць.

. . . .

І мур ля мура,
Як вазоны
За ўходам здольнае рукі,
Стаяць гіганты—павільёны,
Стаяць—вялікімі ўшыркі.

Дзе век
крывавай пагулянкай
Кіпеў запушчаны куток
І век
Былі разбоі з п'янкай—
Паўстаў
навукі
га-ра-док.

* * *

На землю,
Смаглую ў чаканьнях,
Сабраўся лінуць
Дождж ліўнём,
у строі грозных рыштаваньняў
Імчыцца век
ліхім канём.
Імчыцца
з бурай дасягненьняў.
Хоць цяжкасьць
поплеч з ім ідзе..
Але мы ўсе
гарым ў імкненьнях
І сілы дарым барацьбе.
Загон цяпер
Ня будзе зараднік
І дасьць патрэбны ураджай—
Краіна мае ўжо рассаднік
Прыгожы
й радасны, як май.
О, век жыцьця!
У штурмах працы
хай льлецца й мой пот на станкі—
Іду тварыць,
Іду змагацца
З задорам цьвёрдым, як брускі.

* * *

У далях шнурам
леглі хаты,
падпёршы сівія бары,
І зараз,
зараз
экспонаты,
Зямлі й станкоў гаспадары
пакажуць,
чуеш бор кудлаты?
Навокал праца маладая
іскрыць
Сымфонія жыцьця
Цьвіце краіна дарагая,
Зьмяняе ўклад стары зямлі
І ў сьвет камунай павявае.

7/У-30 г.
Менск.

БІБЛІОГРАФІЯ

Е. ШОЛАМАЎ. „РАБОТА ЛКСМБ ПА НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ“. ДАКЛАД НА СТУДЗЕНЬСКІМ ПЛЕНУМЕ ЦК ЛКСМБ. БДВ. МЕНСК 1930 Г., СТАР. 48. ТЫРАЖ 500, ЦАНА 15 КАП.

Трохмесячнік беларускае і нацменаўскае пролетарскае культуры—аграмаднага значэньня мерапрыемства, распачатае па ініцыятыве комсамолу Беларусі, якое ёсьць працягам тае вялікае працы, якую вядзе ленінскі комсамол па нацыянальна-культурнаму будаўніцтву.

Гэтай працы як і трохмесячніку, і прысьвячаўся даклад т. Шоламава на пленуме ЦК. Зараз выдана стэнаграма дакладу. Як зазвычай, БДВ спазьнілася з выданьнем брошуры. Але каштоўнасьць яе ні ў якім разе не паменшылася. Трохмесячнік ня быў абмежаваны тэрмінам кампаніяй, ён толькі завастраў увагу на ўзмацненьні, на разгортваньні працы па ўнядрэньню ў масы культуры пролетарскай—беларускай і нацменаўскай. Праца вялася, вядзецца і будзе весьціся. Справа ў якасьці. Вось—якасьці, усьвядомленьню задач і падстаў працы якраз і дапамагае брошура. Яна орыентуе організацыю, разьбівае тыя шкодныя думкі, што трохмесячнік —кампанія, што ўся праца па нацыянальна-культурнаму будаўніцтву зводзіцца толькі да літаратурных вечароў, м савых чытак твораў пролетарскіх пісьменьнікаў.

Брошура дае правільную орыентоўку ў барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам, шовінізмам усіх колераў, дае напрамак у разгортваньні культурнае працы, ліквідацыі няпісьменнасьці, гаворыць аб прыстасаваньні мастацтва на службу соцыялістычнаму будаўніцтву. Брошура дае па гэтых пытаньнях вычочны матар'ял, дае зарадку.

Большасьць прыкладаў для свае тэмы Шоламаў узяў з беларускае літаратуры. Пытаньню літаратуры наогул адведзена даволі багата месца. І тут ізноў-жа брошура ставіць актуальнае пытаньне аб выхаваньні кадраў пролетарскіх пісьменьнікаў. т. Шоламаў прыводзіць прыкладам організацыю ў Менску „колектыву маладых пісьменьнікаў“, які мог толькі раздрабіць сілы, правільна робячы вывад аб недастатковасьці ўвагі з боку БелАПП'у да літаратурных гурткоў, да пачынаючых пісьменьнікаў. Таварыш Шоламаў сыгналізаваў БелАПП'у наяўнасьць прарываў у яго працы, які, бязумоўна, вельмі небясьпечны.

Пасьля выхаду брошуры мы чыталі пра організацыю БелАПП'ам у Менску цэнтральнага рабочага літгуртка. Гэта—адно з мерапрыемстваў, якое накіравана на зьжыцьцё прарываў. Але патрэбна сталая ўвага і дапамога гурткам пры клюбах, пры леньтутках, у цэхах, патрэбна ўвага і да паасобных адзінак. Трэба падумаць яшчэ і аб наладжаньні магчымасьці друкаваньня пачынаючым. Ёсьць шэраг фактаў няўважлівасьці да пачынаючых, калі яны нават не атрымоўваюць адказаў на дасланыя ў „Маладняк“ творы. У нас шмат гаварылася аб літконсультацыі, яе нават вылучылі, але яна засталася „мёртва народжаным“ дзіцём. Сьвяжэцца масавая праца акруговы філіі. Вось аб чым неабходна падумаць кіраўніцтву БелАПП'у, чытаючы разьдзел брошуры Шоламава, прысьвечаны пытаньням літаратуры. Павінна існаваць літконсультацыя, павінны быць знойдзены шляхі для друкаваньня пачынаючых (калі „Маладняк“ ня можа адвесьці ім сваіх старонак), павінна быць наогул уважлівасьць да пачынаючых, павінна быць дана сталае кіраўніцтва філіям.

Неахайным у брошуры зьяўляецца адно мёсца, якога можна было ўнікнуць пры выпраўленьні стэнограмы.

На стар. 22 аўтар, гаворачы аб школьнасьці творчасьці Зарэцкага, не дае яскравага падзелу разуменьня „романтычны стыль“. (Ёсьць романтызм рэакцыйны, ёсьць і рэволюцыйны). Ён гаворыць аб романтызьме наогул. Гэта заблытвае разуменьне, можа прывесьці да нечаканых вынікаў пры азнаямленьні з творчасьцю іншых пісьменьнікаў, не пазбаўленых у стылі адзнак романтызму. Гэта адзіная заўвага.

У астатнім, паўтараю, кніжка вельмі каштоўная. Яна шмат дапаможа ў справе наладжваньня нацыянальна-культурнага будаўніцтва, у справе барацьбы з скрыўленьнямі і шкодніцтвам на гэтым фронце клясавага змаганьня. Ставіць яна і шэраг жыцьцёвых задач перад пролетарскай літаратурай і яе організацыямі.

Хв. Шынклер.

Фото-нарыс з жыцьця Чырвонай арміі



Зьлева направа: 1. Баскетбол, 2. Прапрацоўваюць зьездаўскія тэзісы, 3. Пярэдняя лінэйка ў лягеры, 4. За разборкай кулямёту, 5. Грае пад'ём

Ліст з віцебскага лесазаводу № 13

ЛІЧБЫ: 17285 І 11208 ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАВАЯВАНЫ

З-за несвоечасовага сканчэньня рамонту і дрэннай яго якасьці заводу пагражае недавыкананьне програмы трэцяга кварталу.

Небясьпека можа быць зьменшана воляй усяго рабочага колектыву. Комуністыя і комсамольцы павінны быць першымі ў барацьбе з небясьпекай.

У трэцім квартале 13-ы лесазавод Віцебску стаяў на штогодным бегучым рамонце. Гэтая стаянка па прамфінпляну павінна была працягнуцца максымум тры тыдні. На справе-ж завод стаяў з 14 красавіка і быў пушчан у ход толькі 4 мая ды і то першыя дні толькі ў адну зьмену; з 18 мая—у дзьве зьмены і 1 чэрвеня—на ўсе тры зьмены.

У красавіку завод працаваў пяць дзён у тры зьмены з дзьвюма рамамі замест трох, дзякуючы таму, што зносілі старую раму і ўстанаўлялі новую і 7 дзён—у дзьве зьмены на дзьвюх рамах. Такім чынам, у трэцім квартале атрымаўся вялікі недахват поўных рабочых дзён, якія і складаюць зараз вялікую пагрозу значнага недавыкананьня (процантаў на 15 прамфінпляну) па расьпілоўцы сыравіны і атрыманьні пілапродукцыі.

Аўладаць лічбамі: 17285 і 11208

Плянам прадугледжвалася ў трэцім квартале расьпілаваць 25.639,40 кубамэтраў сыравіны і атрымаць гатовай пілапрадукцыі 16.163,07 к. м. Завод у красавіку расьпілаваў 2296 км лесаматар'ялаў і атрымаў гатовай продукцыі 1552 км у мае месяцы расьпілована на 6057,91 км і атрымана гатовай продукцыі 3402 км. Разам, за май і сакавік, улічваючы і стаянку заводу, расьпілована 8353,91 км і атрымана 4954,72 км гатовай пілапродукцыі. **Такім чынам, на чэрвень заводу засталося расьпілаваць сыравіны 17285,49 км і атрымаць гатовай пілапродукцыі 11208,35 кубамэтраў.**

Адсюль выцякае, што трэба, каб завод працаваў у тры зьмены і даваў-бы па расьпілаванай сыравіне ня менш 690 км. у дзень для таго, каб выканаць поўнасьцю плянавае меркаваньне 3-га кварталу. Кожная паасобная зьмена—рама павінна выпускаць 77 км, **што зьяўляецца ўпаўне магчымым** пры ўмове наладжанага ходу работы, распарадчасьці цэхавых майстроў і хуткага ўвядзеньня ў курс справы новых кадраў рабочых (якія складаюць процантаў 30—40).

Простоі ізноў пайшлі ўгору

Для гэтага трэба мобілізаваць усю заводзкую грамадзкасьць, каб папярэдзіць прарыў, які можа здарыцца ў выніку склаўшыхся абставін. Рамонт заводу, як мы бачым, праведзен з якаснага боку **нездавальняюча**. Здараюцца вялікія простоі рам, частае псаваньне жывых ролікаў, вялікія завалы ў корпусе, дрэнная работа транспарту. Трэба перавесьці на ўдарнае становішча ўвесь механічны цэх заводу, каб пазьбегчы простояў, якія ў апошні час павялічыліся. Вытворча-эканамічнай групе завкому патрэбна зараз-жа шырока абгаварыць пытаньне аб выкананьні програмы ў трэцім квартале з тым, каб за той час, які застаецца узмацнёнымі тэмпамі наварстаць упушчанае. Трэба шырэй разгарнуць масава-выхаваўчую работу, асабліва ўлічваючы тое, што шмат рабочых нядаўна прышло на завод.

Якасьць—небясьпечны фронт

Пытаньне якасьці продукцыі зьяўляецца балючым і найбольш слабым месцы заводу. Крывізна ў расьпілоўцы, касіна, нагладкасьць, 4-ты гатунак па апрацоўцы і г. д. спрыяюць выпуску продукцыі, якая не адпавядае патрэбнаму стандарту.

Трэба біць трывогу. Небясьпека зрыву прамфінпляну ў 3-м квартале—зусім рэальная небясьпека. Трэба тэрмінова перабудавацца ўсёй заводзкай грамадзкасьці і перавесьціся на ўдарную баявую работу.

Ня дрэйфіць, ня губляць роўнавагі, а з упэўненасьцю кінуцца ў бойку,—папярэдзіць прарыў.

В. Рыжы.

Бясчынствы на Барысаўскай Аўтобазе

Нядаўна з вытворчасьці былі пасланы на працу кандуктарамі 6 комсамолак. Некаторыя шофэры як: **Стральцоў, Раброў Бакун,** *і інш. адразу адчулі, што „чужыя" варваліся да іх і таму акружылі комсамолак варожасьцю. Цьвярозымі яны амаль што ніколі ня бываюць і таму зразумела іх нянавісьць да комсамолак у прыватнасьці да Каплан.*

Апошні факт асабліва абураючы. Два-тры дні таму назад шофэр **Раброў,** *працуючы на аднэй машыне з* **Каплан,** *прывёў машыну на станцыю, а сам з* **Стральцовым** *пашоў п'янстваваць. Машына прастаяла 25 хвілін, і толькі пасьля таго, як* **Каплан,** *разам з пасажырамі, пачала патрабаваць адпраўленьня, п'яныя шофэры павялі машыну. На поўшляху машына зусім застанавілася і п'яныя шофэры, з крыкам: „Каплан, нясі бэнзін!" адмовіліся везьці пасажыраў далей, а потым сталі патрабаваць уходу Каплан з машыны.* **Каплан** *адмовілася. У яе абавязкі ўваходзіць ўвядзеньне машыны ў гараж. Лаючыся, яны аб'ехалі ўвесь горад і толькі а 2 гадзіне ўночы выпадкова дабраліся да гаража.*

Наогул, у Аўтабазе творацца бясчынствы. Дзякуючы адсутнасьці сыстэматычнага, штодзённага кантролю над работай кандуктароў, зараз аказалася, што 3 кандуктары растрацілі больш чым 250 рублёў.

Даюцца вымовы каму трэба і каму ня трэба, і таму вымовы згубілі ўсякае значэньне. Сярод шофэраў толькі адзін партыец, ён-жа і загадчык гаража. Становішчам аўтабазы трэба заняцца.

Соня Фрыдлянд.

„Я не хачу застацца калекай"

Вінаватых у цеганіне—прыцягнуць да адказнасьці

Ліст у рэдакцыю

Дарагая „Чырвоная Зьмена"!

Ты, як орган моладзі, павінна дапамагчы мне ў маім жыцьці, хаця-б асьвятліць на тваіх старонках той бюрократызм нашых дактароў і іншых, якія, ці ўмысьля, або па сваёй халатнасьці да справы імкнуцца аставіць мяне на ўсё жыцьцё калекай. Я знаходжуся ў дзіцячым доме 10 год, да гэтага часу я жыла пры беднай матцы, якая за мной не назірала і вось у адну з няшчасных хвілін майго жыцьця я вывіхнула нагу, ня ведала, бо малой была тады што з-за гэтага мне прыдзецца на заўсёды застацца калекай, застацца за бортам усяго жыцьця.

У дзіцячым доме гэтак сама не зьвярталі ўвагі на мяне, бо вядома, што такіх дзяцей як я надта многа, і каб кожнага выпусьціць у сьвет трэба больш увагі зьвяртаць нашым выхавальцам, якія ад гэтага адхільваюцца абяцанкамі.

Калі мяняліся нашы загадчыкі дзіцячага дому кожны даваў абяцаньне дапамагчы, клапаціцца аб вылячэньні маёй нагі, але боль усё павялічваўся і ад абяцаньняў не зьмяншаўся. Ня гледзячы на гэта, мне ўдалося зрабіць адну опэрацыю ў 29 годзе. Трэба было зрабіць і другую опэрацыю. І вось ад гэтага пачалася цяганіна, мая чарга на опэрацыю даўно прашла, а опэрацыі яшчэ не рабілі. Доктар Шапіра адкладвае ўсё на два тыдні і так ужо некалькі раз бяз конца. Загадчык дому т. Ярхун і доктарша, якая знаходзіцца пры доме, у той бок і глядзець не жадаюць. Вядома, што „паважаным" таварышом да мяне, няшчаснай выхаванкі спраў няма. У іх свае справы, але мне ня хочацца сядзець на шыі дзяржавы паразытам у той час як доктар Шапіра кажа, што маю нагу вылячыць можна, але патрэбна яшчэ адна опэрацыя.

Час не чакае. Мне ўжо 14 год, мае сябры (выхаванкі дзіцячага дому) даўно працуюць на вытворчасьці, а я павінна яшчэ сядзець у дзіцячым доме ды праклінаць тыя хвіліны, калі я нарадзілася на сьвет. Я ня ведаю да каго зьвяртацца. Ты, «Чырвоная Зьмена», павінна мне дапамагчы і каб вінаватыя ў гэтай цяганіне былі прыцягнуты да адказнасьці.

Выхаванка піонэр-комуны
Мэерсон.

ПРАВІЛЫ ПРЫЕМУ

Ў БЕЛАРУСКУЮ ДЗЯРЖАЎНУЮ АКАДЭМІЮ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ІМЯ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВОЛЮЦЫІ НА 1930-31 НАВ. ГОД

1. У вясеньні прыём 1930-31 нав. году будзе прынята ў Акадэмію 500 асоб.

а) на фак-т эканомікі, организацыі і плянаваньня буйнай сельскай гаспадаркі—50 асоб.

б) на фак-т мэханізацыі буйнай сельскай гаспадаркі—75 асоб.

в) на фак-т мэліорацыі—75 асоб.

г) на фак-т организацыі тэрыторыі—50 асоб.

д) на фак-т лясны—50 асоб.

е) на фак-т зоотэхнічны—100 асоб.

ж) на фак-т расьлінагадоўлі—100 асоб.

2. У лік студэнтаў Акадэміі прымаюцца асобы не маладзей 17 год.

УВАГА: Асобы якія жывуць на непрацоўны прыбытак, або пазбаўленыя выбарчых правоў і іх утрыманцы ў Акадэмію ня прымаюцца.

3. Асобы якія жадаюць паступіць у Акадэмію, падаюць аб гэтым на імя дырэктара Акадэміі заяву з абавязковым паказаньнем факультэту і аддзяленьня, на якім жадаюць вучыцца. Да памянёнай заявы далучаюць наступныя дакуманты: а) дакумант аб узросьце (мэтрыка), б) дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын), в) дакумант аб асьвеце (абавязкова орыгінал), г) тры фотографічныя карткі, д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага, е) дакуманты, якія сьведчыў-бы аб соцыяльным і матар'яльным становішчы бацькоў паступаючага да рэволюцыі і пасьля, ж) даведку пасьведчаную нізавой організацыі аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў, з) для сялян акладны ліст па с.-г. падатку за 1929-30 г., а для саматужнікаў адпаведны дакумант аб падатку за 1929-30 г., і) анкету, засьведчаную профэсійнымі альбо савецкімі организацыямі, прычым адказнасьць паводле крымінальнага кодэксу за няправільнасьць дадзеных зьвестак нясуць асобы, якія далі весткі і якія засьведчылі анкету.

УВАГА: Ніякія копіі дакумэнтаў ня прымаюцца, за выключэньнем копіі дакумэнтаў аб адносінах да вайсковай павіннасьці.

УВАГА: Да заявы неабходна прыкладаць паштовыя маркі 20 кап. для адказу падаўцу заявы.

4. Прыём заяў будзе праводзіцца канцэлярыяй Акадэміі з 1/VI па 1/VIII-30 г. Пасьля 1-га жніўня ніякія заявы ня прымаюцца.

5. Асобы, скончыўшыя рабочыя факультэты, пасылаюць свае заявы з усімі дакумантамі, з візай прызыўному адпаведнага Рабфаку, на імя дырэкцыі Акадэміі і механічна залічваюцца ў лік студэнтаў.

6. Усе скончыўшыя рабочыя факультэты, курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, профшколы і фабзавучы на базе 7-мігодкі, тэхнікумы, 9-гадовую агульна-адукацыйную школу, агульна-адукацыйныя 2-гадавыя курсы на базе 7-годкі у 1929-1930 годзе, роўна, як асобы, вытрымаўшыя экзамены пры паступленьні у ВНУ у 1928-29 годзе, 1929-30 г., прыймаюцца ў Акадэмію без экзамену падлягаючы выключна клясаваму адбору.

УВАГА: а) Скончыўшыя профшколы і фабзавучы на базе 7-годкі і тэхнікумы абавязаны для залічэньня прадставіць даведку аб 3-х гадовым стажы ў вытворчасьці пасьля сканчэньня вышэйпамянёнай навучальнай установы.

б) Курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ аслабаняюць ад іспытаў пры паступленьні, калі пасьведчаньне, выдадзенае аб пасьпях васьці сканчэньня курсаў, падпісана прадстаўніком органаў НКА.

7. Усе асобы, якія скончылі школы для дарослых узвышанага тыпу, агульна-адукацыйныя куры, профшколы, або 7-мі гадовыя працоўныя школы і інш., адпавядаючыя ім па курсу навучальныя ўстановы, роўна, як і асобы, якія ня маюць офіцыйнай асьветы, павінны трымаць належныя іспыты ў абхваце курсу рабфаку па матэматыцы, фізыцы, грамадазнаўству прыродазнаўству, літаратуры (беларускай і расійскай) і пісьмовую працу на беларускай мове.

УВАГА: Рабочыя ад варштата і батракі, якія ў гэтым годзе скончылі вячэрнія школы ўзвышанага тыпу, прыймаюцца на расьлінаводны і зоотэхнічны факультэт Акадэміі з іспытамі толькі па белмове. На іншыя факультэты і аддзяленьні Акадэміі яны павінны трымаць іспыты і па-матэматыцы.

8. Усім падаўшым заявы будзе дадзен пісьмовы адказ ня менш, як за 10 дзён да пачатку іспытаў), ці будуць яны дапушчаны да іспытаў. Іспыты будуць праводзіцца выключна з 5-га па 15-ае жніўня 1930 г. Залічаньне-ж у лік студэнтаў робіцца прыймовымі камісіямі з 15 па 25-га жніўня.

9. Для асоб, якія скончылі профшколы, ФЗВу, тэхнікумы, у выпадку іх службы ў Чырвонай арміі, кожны год прабываньня ў арміі залічваецца за год вытворчай працы.

10. Заняткі для новапрынятых пачынаюцца з 5-га верасьня, асобы залічаныя студэнтамі Акадэміі і не прыступіўшыя да вучэбнай працы к 15-га верасьня, выключаюцца са сьпісаў студэнтаў.

11. Згодна пастановы СНК БССР ад 22-га красавіка 1930 г. процантныя суадносіны па курсах пры прыёме ў Акадэмію ўстаноўлены наступныя: рабочых, батракоў і іх дзяцей—45 проц., колгасьнікаў, беднякоў і серадннякоў і іх дзяцей—45 проц., настаўнікаў, служачых і іх дзяцей—5 проц., дзяцей спэцыялістых—5 проц.

Дырэктар Акадэміі **Пінчук П. І.**

Сэкратар Навуч. часткі **Кашура.**

г. Горкі БССР
Аршанскае акругі
8-га чэрвеня, 1930 г.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Усім сэкратарам ячэек КП(б)Б і ЛКСМБ Кастрычнікавага раёну.

Бюро РК КП(б)Б сумесна з бюро РК ЛКСМБ 20-6-30 г. роўна а 6 гадзіне ўвечары ў клюбе імя Леніна (станцыя Менск—пасажырская) склікае раённую нараду з парадкам дню:

1. Недахопы ў рабоце комсамольскай організацыі, далейшыя задачы і парт. кіраўніцтва.

На нараду ў абавязковым парадку і без спазьненьня павінны зьявіцца:

а) усе сябры і кандыдаты бюро ячэек ЛКСМБ.

б) піонэр-важатыя і помважатыя.

в) усе прымацаваныя партыйцы ад бюро парт. ячэек да комсамольскіх ячэек.

— У пятніцу 20 чэрвеня, а 6 га зіне ўвечары ў памяшканьні АК ЛКСМБ адбудзецца пасяджаньне прыймовай камісіі АК ЛКСМБ.

Яўка сяброў камісіі абавязкова.

МенАК ЛКСМБ.

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599